Нашыя аўтары

Адамовіч Славамір — паэт, эсэіст, публіцыст. Аўтар кніг «Кальварыйскія клёны», «Зямля Ханаан», «Турэмны дзёньнік», «Плавільшчыкі расы» і інш. Нарадзіўся ў 1962 годзе на станцыі Унежма Архангельскай вобласьці (Расія). У 2002 годзе зьехаў у Нарвегію.

Бадак Алесь – паэт, крытык, публіцыст. Аўтар кніг «Будзень», «За ценем самотнага сонца» і інш. Нарадзіўся ў 1966 годзе ў в.Туркі на Ляхаўшчыне. Жыве ў Менску.

Барадулін Рыгор — народны паэт Беларусі. Паэт, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1976 г.). Аўтар кніг паэзіі «Маладзік над стэпам», «Рунець, красаваць, наліваццa!», «Нагбом», «Адам і Ева», «Рум», «Вечалле», «Евангелле ад мамы» і інш. Нарадзіўся ў 1935 годзе на хутары Верасоўка на Ушаччыне. Жыве ў Менску.

Бараташвілі Ніколаз — грузінскі паэт. Літаратурная спадчына Бараташвілі – паэма і каля 40 вершаў. На беларускую мову яго творы перакладалі А.Вялюгін, Е.Лось, Я. Семяжон і інш. Нарадзіўся ў 1817 годзе ў Тбілісі. Памёр у 1845 годзе.

Брыль Янка — народны пісьменьнік Беларусі. Празаік, перакладчык, публіцыст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952 г.), Дзяржаўнай прэміі БССР (1982 г.), Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1963 г.). Аўтар кніг «Апавяданні», «У Забалоцці днее», «Птушкі і гнёзды», «Жменя сонечных промняў», «Я з вогненнай вёскі» – у сааўтарстве з А. Адамовічам і У. Калесьнікам, «З людзьмі і сам-насам» і інш. Нарадзіўся ў 1917 годзе ў Адэсе. Жыве ў Менску.

Быкаў Васіль — народны пісьменьнік Беларусі. Празаік, публіцыст. Лаўрэат шматлікіх дзяржаўных і міжнародных літаратурных прэміяў. Аўтар кніг «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца», «Знак бяды», «Кар'ер», «Сьцяна», «Пахаджане», «Доўгая дарога дадому» і інш. Нарадзіўся ў 1924 годзе ў в.Бычкі на Ушаччыне. Памёр у 2003 годзе.

Вашкевіч Руслан — мастак. Творы захоўваюцца ў прыватных зборах у Германіі, Польшчы, Галандыі, Расіі, Эстоніі, ЗША і інш. Нарадзіўся ў 1966 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

Гілевіч Ніл — народны паэт Беларусі. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Прафесар. Паэт, драматург, перакладчык, фалькларыст, літаратуразнаўца. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1980 г.). Аўтар кніг «Песня ў дарогу», «Прадвесне ідзе па зямлі», «Перазовы», «Паэтыка беларускай народнай лірыкі», «Святлынь», «Родныя дзеці» і інш. Нарадзіўся ў 1931 годзе ў в. Слабада на Лагойшчыне. Жыве ў Менску.

Голуб Юрка — паэт, журналіст. Аўтар кніг паэзіі «Гром на зялёнае голле», «Дрэва навальніцы», «Векапомнае поле», «Помню пра сябе» і інш. Нарадзіўся ў 1947 годзе ў в.Горны на Зэльвеншчыне. Жыве ў Гародні.

Грыль Франц Салес — супрацоўнік Інстытута імя Гётэ Інтэр Нацыёнес (Культурны цэнтр Федэратыўнай Рэспублікі Германія). Ён і ягоная жонка Крысьцін Грыль любяць і калекцыянуюць творы мастацтва, валодаюць графікай сусьветна вядомых мастакоў С. Далі, М. Шагала, П. Пікаса, А. Маціса, В. Фостэл, а таксама творамі беларускіх мастакоў – найперш прадстаўнікоў рэалістычнага накірунку... Нарадзіўся ў 1939 годзе ў Васэрбургу на Іне (Германія). Жыве ў Германіі.

Данільчык Аксана – паэтка, перакладчыца. Аўтар кнігі «Абрыс Скарпіёна». Нарадзілася ў 1970 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

Дзядзенка Зьміцер — паэт, журналіст, літаратуразнаўца. Творы друкаваліся ў «Полымі», «ЛіМе», «Нашай

ніве» і інш. Нарадзіўся ў 1972 годзе ў мястэчку Барань на Аршаншчыне. Жыве ў Менску.

Дранько-Майсюк Леанід — паэт, празаік, эсэіст, перакладчык. Аўтар кніг «Вандроўнік», «Тут», «Над пляцам», «Акропаль», «Стомленасць Парыжам», «Гаспода» і інш. Нарадзіўся ў 1957 годзе ў Давыд-Гарадку. Жыве ў Менску.

Івашчанка Анатоль — празаік, паэт. Творы друкаваліся ў «Нашай ніве», «Дзеяслове», універсітэцкіх зборніках. Нарадзіўся ў 1981 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

Законьнікаў Сяргей — паэт, перакладчык, публіцыст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1991). Аўтар кніг «Бяседа», «Устань да сонца», «Пакуль жыве мая бяроза», «Прысак часу», «Заклінанне», «Лісцем дарога запала...» і інш. Нарадзіўся ў 1946 годзе ў в. Слабада на Бешанковіччыне. Жыве ў Менску.

Карамазаў Віктар – празаік, публіцыст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990). Аўтар кніг «Падранак», «Спіраль», «Пушча», «Дзень Барыса і Глеба», «Дома», «Дзяльба кабанчыка», «Крыж на зямлі і поўня ў небе», «З вясною ў адным вагоне» і інш. Нарадзіўся ў 1934 г. у г.Чэрыкаў. Жыве ў Менску.

Качаткова Паліна — празаік, публі-цыст, журналіст. Апавяданьні друкаваліся ў «Нашай ніве», «Дзеяслове» і інш. Нарадзілася ў 1968 годзе ў Оршы. Жыве ў Менску.

Клімянкоў Іван — празаік. Аўтар кніг «Сеанс гіпнозу» і інш. Нарадзіўся ў 1947 годзе ў в. Хляўно на Кармяншчыне. Жыве ў Менску.

Корбут Віктар — журналіст, дасьледнік гісторыі. Артыкулы друкаваліся ў часопісах «Arche», «Спадчына», «Студэнцкая думка» і інш. Нарадзіўся ў 1981 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

Крывашэйцава Кацярына — перакладчыца. Навучэнка Беларускага Калегіюму, асьпірантка Беларускай акадэміі музыкі. Нарадзілася ў 1980 годзе ў Быхаве на Магілёўшчыне. Жыве ў Менску.

Кудасава Наста — паэтка. Студэнтка філфаку БДУ. Нарадзілася ў 1982 годзе ў Полацку. Жыве ў Менску.

Мяльгуй Анатоль — журналіст, публіцыст, музычны крытык. Першы старшыня рок-клубу «Няміга», аўтар шматлікіх артыкулаў па праблемах сучаснай беларускай культуры. Адзін з аўтараў кніг «Праз рок-прызму», «Сто лепшых альбомаў беларускага року і ня толькі». Нарадзіўся ў 1957 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

Пушкарова Натальля — паэтка. Нарадзілася ў 1987 годзе ў Кіеве. Вучыцца ў Бабруйскай славянскай гімназіі. Жыве ў Бабруйску.

Сьцебурака Усевалад — празаік, паэт. Асьпірант БДТУ. Вершы друкаваліся ў «Нашай ніве», «ЛіМе», проза — у «Дзеяслове». Нарадзіўся ў 1981 годзе ў Жлобіне. Жыве ў Менску.

Тарас Валянцін — паэт, празаік, перакладчык, публіцыст. Аўтар кніг «Прощальные костры», «Дань времени», «Доверие», «Две тетради», «Размышление», «Пазіцыя», «На высьпе ўспамінаў» і інш. Нарадзіўся ў 1930 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

Твараноўіч Галіна — паэтка, літаратуразнаўца. Аўтар кніг «Белорусская и югославская военная проза», «Пакутаю здабыты мір», «Верасы Дараганава» і інш. Нарадзілася ў 1955 годзе ў мястэчку Дараганава на Асіповіччыне. Жыве ў Польшчы.

Томас Дылан — ангельскі паэт, празаік. Аўтар кніг «Дваццаць пяць вершаў», «Мапа каханьня», «Сьмерці і ўваходы», «Поўны збор вершаў» і інш. Нарадзіўся ў 1914 годзе ва Уэльсе. Памёр у 1953 годзе.

Цітарчук Марыя — празаік, паэтка. Студэнтка Гарадзенскага дзяржуніверсітэту імя Я. Купалы. Нарадзілася ў 1985 годзе ў Гародні. Жыве ў Гародні.

Summary

DZIEJASŁOÚ goes on discovering the unknown Vasil Bykaú. About ten years before *A Long Way Back Home*, the People's Writer of Belarus told his story in two notebooks, which throw a new light on some episodes of the classic's life. This issue presents the first part of Vasil Bykaú's biographical notes, written in 1993-94 and covering his green years up to 1941, when Nazi Germany invaded the USSR (see *The Dotted Line of Life*).

The ***Prose*** section has in stock a thrilling and gripping *Champaign Bottle Cork* by Ivan Klimiankoú and *An Edgy Romance* by Leanid Drańko-Majsiuk, which is by no means less electrifying. Besides, Viktar Karamazaú offers his short stories *Mad March Hares* and *My Easter*, while the People's Poet of Belarus Nił Hilevič tells his *Funny Stories* about his friends and literature in general. You can also find here *Staying within the Parameters* by Usievaład Ścieburaka.

The ***Poetry*** section contains *A High and Intense Note* by Siarhiej Zakońnikaú, *The Land in Heaven* from a book of poems *The Fourth Guard* by Halina Tvaranovič, *The Angel of the North* by Aksana Danilčyk, *Longing for Spring!* by Sofja Šach and *Stay with Me!* by the ***DZIEJASŁOÚ*** prize nominee Nasta Kudasava.

There are two short stories, *The Map of Love* and *The Visitor* by Dylan Thomas in the ***Translations*** section. They have been rendered into Belarusian by Kaciaryna Kryvašejcava. Alongside these, Jurka Hołub brings forth his version of Georgian poet Nikolazo Baratashvili's poems (see *The Prayer Raised to the Blue*).

The issue's debutantes are a Babrujsk schoolgirl Natalla Puškarova and a Harodnia student Maryja Citarčuk. The former comes up with her poems *Shyly Has It Rained*, whereas the latter offers you two novellas, *Happiness Is Drunk like Absinthe* and *The Legend of the Mound.*

The ***Essays, Criticism and Music*** section is rich in interesting contributions, too. Poet Sławamir Adamovič, who now resides in Norway, remembers his childhood and gives an account of an émigré's life in *The Moment of Truth*. Vasil Žuk presents a teacher Mikoła Paškievič's letters to Vasil Bykaú, which turn out a work of literature with a happy ending, to be read in one sitting… We have also published a few chapters from *The Isle of Memories* by Valancin Taras, in which the writer looks back on the time of the Second World War (see *The Boy in an Old Snapshot*). Meanwhile, Anatol Mialhuj analyses the state of things at the Belarusian FM-stations, now that it has been decreed that they should give at least 75 per cent of their time to 'Belarusian' music (see *FM-air as a Battlefield*). In his contribution to ***DZIEJASŁOÚ*** Franz Sales Grill features young Belarusian artist Rusłan Vaškievič, who is quite well-known abroad. The German art critic calls him *The New Avant-garde Artist Armed with Intellectual and Ironic Intuition.*

There are two interviews published in the issue. In the first one, *It Is Usage that Forms a Language*, Viktar Korbut discusses the problems of Belarusian spelling with Siarhiej Zaprudzki. Meanwhile, in the second one Palina Kačatkova converses with the famous Czech dissident Pietruška Šustrova, who claims that *Being a Dissident Means Being Brave*.

In ***Bookronicle*** Anatol Ivaščanka gives his appreciation of some books, recently published in Belarus, as well as Biełastok, Poland, and Vladivostok, Russia.

And last but not least, ***DZIEJASŁOÚ***'s questionnaire on the secrets of their creative process is answered by the People's Writer of Belarus Janka Bryl, the People's Poet of Belarus Ryhor Baradulin and ***DZIEJASŁOÚ***'2003 prize winner Aleś Badak.

Слова ад «Дзеяслова»

Шаноўныя чытачы!

На другое паўгоддзе на «Дзеяслоў»
можна падпісацца ў любым паштовым аддзяленьні Беларусі.

Наш індэкс – 74813 (для індывідуальных падпісчыкаў),
– 748132 (для ведамаснай падпіскі).

Чытайце «Дзеяслоў» таксама ў Інтэрнэце: **www.dziejaslou.by**

Да ведама аўтараў:
рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Рэдакцыя не нясе адказнасьці
за выкладзеныя ў аўтарскіх тэкстах факты.

Пры перадруку
спасылка на «Дзеяслоў» абавязковая.

У «Дзеяслове» скарыстаныя фотаздымкі:
Сяргея Шапрана, Уладзіміра Крука,
Віктара Стралкоўскага, Юрыя Дзядзінкіна.